У 1969 годзе канцылярыя ЦК КПСС атрымала сакрэтны ліст, у якім паведамлялася: «Комитет государственной безопасности Белоруссии располагает данными о политически нездоровых настроениях писателей Карпюка и Быкова... Карпюк нелегально распространяет среди знакомых различные антисоветские пасквили... Отрицательно воздействует на молодежь... С санкции ЦК компартии республики готовятся мероприятия, направленные на предотвращение возможных враждебных акций названных лиц...». Пад лістом стаяў подпіс старшыні КГБ СССР Юр'я Андропава.

# Аляксей Карпюк

У дачыненьні да Аляксея Карпюка плянаваныя гэбістамі захады хутка выявіліся ў допытах, ператрусах, выключэньні з партыі.

Яго, былога камандзіра партызанскага аддзелу імя Каліноўскага, кавалера савецкіх і польскіх баявых узнагародаў, на падставе сфабрыкаваных чэкістамі Фаміным і Клімовічам дакумэнтаў абвінавацілі ў калябарацыянізьме. Два гады Карпюк ня мог уладкавацца на працу.

Потым яго адновяць у КПСС, але на самым пачатку дзевяностых ён сам выйдзе адтуль. Праўда, пры гэтым партбілет пакіне сабе, напісаўшы ў заяве, што робіць гэта «на памяць пра летуценьні маладосьці».

Але непапраўным летуценьнікам — і змагаром за свае ідэалы — ён будзе заставацца праз усё жыцьцё: і ў творчасьці, і на пасадзе сакратара Гарадзенскага аддзяленьня Саюзу пісьменьнікаў, і ў нязьменна вострых і дасьціпных прамовах на літаратурных зьездах і пленумах.

Я пазнаёміўся зь ім якраз пасьля аднаго з такіх выступаў, у якім Аляксей Нічыпаравіч, абрынуўшыся на ўсеўладнасьць савецкае намэнклятуры, расказаў, як сын тагачаснага эгіпецкага прэзыдэнта Насэра заваліў уступныя экзамэны ўва ўнівэрсытэт.




З дачкой Аленай. 1950-я

Расказаў, каб рытарычна запытацца ў залі: «Ці магчыма такое ў нас нават на ўзроўні дзяцей сакратара райкаму?»

У гады перабудовы ён уступіць у БНФ, заявіць пра сябе як пра таленавітага публіцыста, неартадаксальна трактуючы падзеі верасьня 1939 году і калектывізацыі.

Аднойчы на гарадзенскай вуліцы, ідучы амаль подбегам, каб не адстаць ад ягонай заўсёды шпаркай хады, я сказаў спадару Аляксею, што ці не найлепшым творам пра Заходнюю Беларусь лічу ягоны раман «Вершалінскі рай». Інтэрвію Зянона Пазьняка, дзе той назаве Карпюкову Данута з аднайменнай аповесьці (якая, дарэчы, перавыдавалася восем разоў) самым дарагім для яго жаночым вобразам ува ўсясьветнай літаратуры, Аляксей Нічыпаравіч прачытаць ужо не пасьпеў.

У Горадні дагэтуль няма вуліцы імя Карпюка, як і вуліцы імя ягонага сябра і аднадумца Васіля Быкава.

**Аляксей Карпюк**
14.4.1920, в. Страшава, Беласточчына –
14.7.1992, Горадня